**Пазнавальная экскурсія ў**
**ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка» для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.**
**Наведванне выставы, прысвечанай Дню касманаўтыкі**

12 красавіка 2021 года для атрымальнікаў паслуг у аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна» праведзена пазнавальная экскурсія ў ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка». Экскурсію правяла Баркоўская Ірына Канстанцінаўна - бібліятэкар аддзела абслугоўвання. Маладыя людзі зазірнулі ў чытальную залу, абаненцкі аддзел, дзіцячую бібліятэку. Прайшоўшы ў чытальную залу, зручна размясціўшыся, маладыя людзі пачулі расказ Швец Вольгі Вітальеўны, бібліятэкара аддзела абслугоўвання, пра тое, што 60 гадоў таму першы чалавек выйшаў у адкрыты космас. Гэта быў Юрый Гагарын. Таксама Вольга Вітальеўна з гонарам прадставіла інфармацыю аб беларускіх касманаўтах: гэта - Пётр Клімук, Уладзімір Каваленка і інш., якія таксама пабывалі ў адкрытым космасе. Наведвальнікі выставы азнаёміліся з літаратурай, з перыядычнымі выданнямі Рэспублікі Беларусь, у якіх адлюстравана інфармацыя, прысвечаная Дню касманаўтыкі.



